ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO. 31 (3487) ● ● ЧАЦВЕР, 18 ЖНІЎНЯ , 2016

ШТОТЫДНЁВІК "ГОЛАС РАДЗІМЫ" МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**Далёкія зоркі Бацькаўшчыны**

Прэзентаваць кнігу "Мае карані" і адзначыць 80-гадовы юбілей на радзіме прадкаў Зянона Сабчук прыляцела з Аргенціны Стар. 2



**Твар руплівай гаспадыні** Стар. 3



**Родны бераг мастака**

Творчасць Станіслава Жукоўскага прыцягвае ўвагу сяброў Мастацкага аб'яднання "Таварыства перасоўных мастацкіх выстаў. XXI стагоддзе" Стар. 4

ТАЛЕНТЫ З ДЫЯСПАРЫ

# Чароўныя акарыны Ганны Радзівонавай

## Арыгінальныя творы мастацтва нараджаюцца ў Іркуцку пад уплывам беларускіх народных традыцый

Пра таленавітую мастачку-керамістку Ганну Радзівонаву, якая, жывучы ў Іркуцку, вельмі крэатыўна выкарыстоўвае ў сваёй творчасці беларускія культурныя традыцыі, мы крыху пісалі ("Месца пад сібірскім сонцам" — ГР, № 28, 28.07.2016). Засталося, аднак, "за кадрам": як яна далучылася да беларускай культуры? Пэўна што не выпадкова! Магчыма, актывістам іншых беларускіх суполак цікава будзе даведацца: Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага мае і такі кірунак дзейнасці, як… дапамога студэнтам. Мы ахвотна іх кансультуем, калі нехта бярэцца пісаць курсавыя, робіць дыпломныя працы па беларускай тэматыцы. Такіх энтузіястаў, дарэчы, за час існавання ІТБК было нямала. А нам па-ранейшаму прыемна, калі багатая беларуская культура выклікае інтарэс у маладых даследчыкаў.

Сярод такіх глыбокіх, духоўна багатых, адкрытых да новага досведу маладых людзей аказалася і Ганна Радзівонава, выпускніца Іркуцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта. Яна вучылася ў Інстытуце выяўленчых мастацтваў і сацыяльна-гуманітарных навук, сябруе з мясцовымі беларусамі, актыўна ўдзельнічае ў нашых святах, фэстах. Дарэчы, мастачка і яе творы-сувеніры ёсць і на здымках у леташняй публікацыі "Гасціннасць Байкала" (ГР, № 38, 8.10.2015). Так што, можна смела казаць, прапіталася яна ўжо беларускім духам. І вось летась Ганна на паспяхова абараніла на кафедры дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва дыплом "Керамічныя музычныя інструменты па матывах славянскай культуры для правядзення беларускага свята Гуканне Вясны" Праца атрымала ацэнку "выдатна". Акрамя таго, да станоўчых, цудоўных водгукаў іркуцкіх мастацтвазнаўцаў з часам дадалося захапленне гараджан і гасцей Іркуцка, якія наведвалі персанальную выставу Ганны ў Іркуцкім абласным Доме народнай творчасці. А сёлета з сярэдзіны чэрвеня ў Гарадскім выставачным цэнтры імя В. Рогаля таксама прадстаўлены яе арыгінальныя творы — на выставе "Беларускае рамяство жыве ў Прыбайкаллі". Выстава, як мы пісалі, прысвячаецца 20-годдзю ІТБК. І вось такім чынам — пагадзіцеся, вельмі прыгожа і арыгінальна! — пашыраецца беларуская культура ў Прыбайкаллі. → Стар. 3



Ганна Радзівонава старанна апрабоўвае гучанне кожнай ноты сваіх акарын

ВЕСТКІ

## Самыя культурныя

Кацярына Аляксандрава

**Беларускія населеныя пункты пазмагаюцца за званне "Горад культуры ў Год культуры"**

Як паведаміла журналістам першы намеснік міністра культуры Беларусі Ірына Дрыга, конкурс пад назвай "Горад культуры ў Год культуры" стане своеасаблівым падвядзеннем вынікаў Года культуры. "Вобразна кажучы, упершыню будуць вызначаны самыя культурныя населеныя пункты, якія ўнеслі найбольшы ўклад і ў развіццё культуры, і ў развіццё турызму. Будуць названы лепшы абласны цэнтр, лепшы горад абласнога падпарадкавання, лепшы горад раённага падпарадкавання, лепшы пасёлак гарадскога тыпу і лепшы аграгарадок", — сказала Ірына Дрыга.

Вядома, што сёння ў рэгіёнах рэалізуецца шмат цікавых праектаў, ёсць нямала самабытных населеных пунктаў, дзе праводзяцца яркія фэсты, адраджаюцца народныя промыслы, дзейнічаюць экскурсійныя маршруты. Так, у вёсцы Селішча, што ў Лепельскім раёне Віцебшчыны, шмат год запар ладзяць абрадавую гульню "Жаніцьба Цярэшкі", а аграгарадок Семежава Капыльскага раёна Міншчыны знакаміты "Каляднымі царамі". "Январскія музычныя вечары" ладзяцца ў Брэсце, фестываль народнай творчасці, промыслаў і рамёстваў "Дрыбінскія таржкі" — у пасёлку Дрыбін Магілёўшчыны. А аграгарадок Лясковічы, што ў Петрыкаўскім раёне Гомельшчыны звычайна ў жніўні склікае наведнікаў на Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый "Зоў Палесся".

Сапраўды, колькі цікавых культурных падзей праходзіць у вялікіх і малых гарадах Беларусі! Вядома ж, хацелася, каб яны сталі аб'ектам увагі турыстаў, гасцей і жыхароў краіны.

ПРЫЯРЫТЭТЫ

# Тут нараджаецца жыццё

Іна Ганчаровіч

**Дзясяткі тысяч немаўлят нарадзіліся і прайшлі лячэнне ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры "Маці і дзіця"**

Быць маці — пэўна, самае вялікае жаданне любой жанчыны. Але часам бываюць абставіны, і гэта накат пры вялікім жаданні не ўдаецца. Ведаю такую жыццёвую гісторыю. Мінчанка Таццяна Ш. амаль 20 гадоў патрацiла, каб стаць мамаю. І стала! Яе парада іншым: не варта адчайвацца! "Пачуць ад лекара ў 20 гадоў дыягназ бясплоддзе — вельмі страшна, — па гэты час яна ўспамінае былое з дрыжыкамі ў голасе. — Былі дэпрэсія, слёзы, вельмі доўгія гады лячэння… І нарэшце — такая доўгачаканая цяжарнасць. З першых дзён я назіралася ў РНПЦ "Маці і дзіця", было нямала ўскладненняў. І вось 14 лютага, якраз у Дзень святога Валянціна, з'явіліся на свет тры чароўныя хлопчыкі. Дарэчы, аднаго з іх назвалі Валянцінам. А маленечкія: кожны вагой трошкі больш за кілаграм... Першыя тыдні літаральна ўвесь час ішла барацьба і лекараў, і нованароджаных за жыццё. Выкарабкаліся! Цяпер маім сынам — па чатыры гады. Здаровыя, актыўныя, абсалютна ні ў чым не саступаюць аднагодкам. У тым вялікая заслуга лекараў Цэнтра, вялікі ім дзякуй за маё мацярынскае шчасце".

Такіх "станоўчых" гісторый у РНПЦ "Маці і дзіця" ведаюць шмат. Гэта — вядучая ўстанова краіны ў службе аховы мацярынства і дзяцінства. Тут шмат каму лекары не толькі дапамаглі з'явіцца на свет, але і, вобразна кажучы, адаптавацца ў ім для жыцця. "Многія з цяперашніх пацыентак гадоў дзесяць таму і марыць не маглі пра мацярынства, — расказвае намеснік дырэктара Цэнтра па навуковай рабоце, спецыяліст у галіне акушэрства і гінекалогіі, кандыдат медыцынскіх навук Іван Курловіч. — Дзякуючы высокаму прафесіяналізму лекараў, аснашчэнню клінікі ўнікальным абсталяваннем і ўкараненню ў практыку суперсучасных тэхналогій, мы сёння з упэўненасцю можам сказаць: дыягназ бясплоддзе сёння для жанчын — не прысуд, а лячэнне яшчэ не народжаных дзяцей для нас ужо не фантастыка". → Стар. 2



У рэспубліканскім цэнтры "Маці і дзіця"

ПРЫЯРЫТЭТЫ

# Тут нараджаецца жыццё

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

У Цэнтры аказваюць дапамогу жанчынам і дзецям з найбольш цяжкай паталогіяй. "Тэхналогіі ў нас такія, што дапамагаюць замацавацца ў жыцці нават глыбока неданошаным дзецям, — прадўжае субяседнік. — Уявіце сабе: мы працуем з нованароджанымі дзецьмі ад 500 грамаў. Ім патрэбен асаблівы тэмпературны рэжым, малога трэба абараніць ад шуму і болю... Усё гэта патрабуе суперсучасных тэхналогій, і, вядома ж, высокага прафесіяналізму лекараў. І ўсё гэта ў нас ёсць. А па ўзроўню тэхнікі, з якой працуем у цэнтры, мы не саступаем ніводнай заходнееўрапейскай краіне".



У Цэнтры "Маці і дзіця" аберагаюць кожнага з немаўлят

Часам малыя, у тым ліку і яшчэ ненароджаныя, маюць патрэбу ў спецыфічных аперацыях. Па гэты час ва ўсім свеце іх робяць толькі ў высокаспецыялізаваных клініках. "Сапраўды, любое ўмяшанне, калі дзіця яшчэ ў мацярынскім улонні, вельмі складанае і вельмі рызыкоўнае, — прыадкрывае тонкасці сваёй прафесіі Іван Курловіч. — Але ў некаторых выпадках гэта, бадай, адзіны шанц, каб выратаваць жыццё дзіцяці. Нам, дарэчы, паспяхова ўдалося вырашыць праблему з жанчынамі з рэзус-адмоўнай групай крыві: у іх часам узнікае рэзус-канфлікт, гэта значыць несумяшчальнасць груп крыві маці і плоду. Раней, калі здаралася такое, былі ці то заўчасныя роды, ці то мёртванароджанае дзіця. А цяпер у Цэнтры ўкаранёна такая методыка, што ідзе своечасовая дыягностыка, а також сама лячэнне: робім унутрычэраўнае пераліванне крыві. Такая аперацыя паляпшае стан плоду, і цяжарнасць прадаўжаецца. Бывае, такое робім пад час цяжарнасці да 9-10 разоў. І нараджаецца зусім здаровае, даношанае дзіця. А калі ёсць затрымка з развіццём плоду, то мы можам падкармліваць яго: праз адмысловую сістэму. У нас добрыя паказчыкі выношвання дзяцей пры шматплодный цяжарнасці, бо і там бываюць свае складанасці. Сёння ў Беларусі жывуць і добра развіваюцца тыя малыя, якія, бо патрэбна было, падвергліся хірургічнаму ўмяшанню лекараў яшчэ да нараджэння".

Што яшчэ можа прапанаваць навука, з якімі хваробамі жанчын і ненароджанага яшчэ дзіцяці можа справіцца РНПЦ "Маці і дзіця"? Іван Васільевіч запэўніў мяне, што вельмі многае: "Дзякуючы сучасным тэхналогіям, эксклюзіўнаму абсталяванню, якое ёсць толькі ў нашай клініцы, мы дапамагаем нарадзіць жанчынам з паталогіяй сардэчна-сасудзістай і эндакрыннай сістэмы, з захворваннямі крыві ды злучальнай тканкі... А лячэнне малых задоўга да іх з'яўлення на свет у нас — ужо звыклая справа. Дарэчы, амаль усе ўнутрычэраўныя аперацыі, якія праводзяцца ў Цэнтры, малаінвазіўныя: праводзяцца пры мінімальным умяшанні ў арганізм і дзіцяці, і жанчыны, пад мясцовай анестэзіяй. Яны — унікальныя не толькі для Беларусі, але і пакуль у свеце. Таму да нас часта прыязджаюць абследавацца, лячыцца і нараджаць жанчыны з-за мяжы: Расіі, Украіны, краін Цэнтральнай Азіі. Для замежных пацыентак гэта платная паслуга. З пералікам паслуг, коштамі на іх можна азнаёміцца на сайце medcenter.by. А для жыхароў Беларусі ўсе аперацыі — бясплатныя.

Дарэчы, па выніках сацапытання, якое праводзілася па ўсёй Беларусі ў жніўні 2015 года, РНПЦ "Маці і дзіця" атрымаў дыплом фіналіста ў намінацыі "Спецыялізаваны медыцынскі цэнтр", а таксама прэмію спажывецкага прызнання "Народная марка Беларусі-2016". А на пачатку года калектыў РНПЦ стаў лаўрэатам прэміі "За духоўнае адраджэнне". Іван Курловіч ганарыцца такім прызнаннем працы калектыву: "Гэтыя высокія ўзнагароды — знак таго, што мы запатрабаваныя, што пра нас ведаюць, нам давяраюць самае дарагое, што ёсць у бацькоў на зямлі — здароўе сваіх дзяцей".

**Даведка ГР.**

Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, сёння Беларусь — на 25-м месцы сярод 179 краін па камфортнасці мацярынства. Па паказчыку нізкай дзіцячай смяротнасці краіна займае трэцюю пазіцыю: побач з Вялікабрытаніяй, Швейцарыяй, Францыяй, Іспаніяй і Бельгіяй.

БЛІЗКІЯ ЛЮДЗІ

# Далёкія зоркі Бацькаўшчыны

Кацярына Мядзведская

**Прэзентаваць кнігу "Мае карані" і адзначыць 80-гадовы юбілей на радзіме продкаў Зянона Сабчук прыляцела з Аргенціны**

На прэзентацыі кнігі "Мае карані" ў мінскім Доме дружбы Зянона Сабчук, аргенцінка з беларускімі родавымі каранямі казала: пабываць на радзіме продкаў марыла з дзяцінства. Дачка эмігранта Канстанціна Арцюха з вёскі Катмінаўцы, што пад Баранавічамі, шмат ведае пра краіну з аповедаў бацькі: пра сям'ю, побыт, заняткі, традыцыі, святы. Пра тое і напісала ў кнізе, а яшчэ — пра сваіх дзяцей і ўнукаў з горада Абэра, што ў правінцыі Місьёнэс. Дарэчы, для іх і ствapала мемуары: каб ведалі, хто яны і адкуль. Вокладку ж да кнігі з беларускай бярозкай малявала ўнучка аўтаркі Вікторыя: разам са сваёй цёцяй Сільвіяй (дачкой Зяноны) юная мастачка і суправаджала бабулю ў вандроўцы па Беларусі.

Выкладчык іспанскай мовы МДЛУ Мікола Ляніўка, які рабіў пераклад кнігі Зяноны Канстанцінаўны на рускую мову, адзначаў: "Выдатна напісана пра вёску, хату, родных… Калі б сам не ведаў, то не паверыў бы, што аўтарка не жыла ў Беларусі". А яна ж толькі бывала тут. Упершыню — у 1987-м, калі па лініі Чырвонага крыжа знайшліся родныя ў Беларусі: дзеці ды ўнукі малодшай сястры бацькі Зінаіды, у гонар якой і названая Зянона (толькі па аргенцінскі лад). Тады ж госця пабывала ў таварыстве "Радзіма", пазнаёмілася з Галінай Навіцкай. Дагэтуль перапісваюцца, Галіна Аляксандраўна дасылае заакіянскай сяброўцы рэцэпты беларускіх страў, дапамагае ладзіць сустрэчы з Бацькаўшчынай. Вось і гэтую яны арганізоўвалі разам.

Зянона Сабчук бывала ў 90-х на адным са з'ездаў беларусаў свету ў Мінску, у 2008-м завітала ў Маладзечна. І дзякуючы яе намаганням гэты беларускі горад стаў пабрацімам аргенцінскага Абэра. Сёлета ж супляменніца планавала наведаць вёску бацькі Катмінаўцы і разам з роднымі адзначыць 80-я ўгодкі. На сустрэчу з цёцяй у Мінск з Баранавіч прыехала пляменніца спадарыні Зяноны. Казала: яе бацька Аркадзь шмат год таму бываў у Аргенціне, надзвычай уразіла яго чырвоная зямля таго кантынента… Дарэчы, менавіта зямля і вабіла на пачатку мінулага стагоддзя перасяленцаў з многіх краін, у тым ліку і з Беларусі. Амаль месяц, з 31 сакавіка па 22 красавіка на параходзе дабіраўся Канстанцін Адамавіч Арцюх да Амерыкі. Ды й не ведаў, што патрапіць у Паўднёвую… З сабой вёз невялікі чамаданчык з рэчамі ды Евангелле. Тую спадчыну, што стала сямейнай рэліквіяй, захоўвае сёння дачка Зяноны Сільвія.



КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

Пра гісторыю сваёй сям'і Зянона Сабчук напісала кнігу

А зямлю Канстанцін Арцюх за акіянам атрымаў: 25 гектараў сельвы — субтрапічных джунгляў… Аднак працаваў наш зямляк, не шкадуючы сіл. Пабудаваў дом, стварыў ферму. Ажаніўся з дачкой украінца, якая нарадзілася ўжо ў Аргенціне. У сям'і іх было тры дачкі: Ліза, Соня і Зянона. Дружная сям'я і ў самой Зяноны: выйшла замуж за хлопца з украінскімі каранямі, выгадавала двух дачок і сына, цяпер у яе пяць унукаў, ёсць і праўнукі. Дарэчы, яе дачка Сільвія, спявачка, гадоў 20 таму бывала ў Беларусі, удзельнічала ў "Славянскім базары". На гэты раз і ў Доме дружбы выканала пад гітару некалькі песень, прысвечаных маці, Аргенціне.

Чакаў Зянону Канстанцінаўну ў Мінску сюрпрыз: на прэзентацыю яе кнігі з Полацка прыехала аўтарка праекта "Полацкі абярэг" Ніна Ярмух з Народнага клуба лапікавага шытва "Рошва". Як вядома, у стварэнні абярэга паўдзельнічалі многія беларусы замежжа. У сімвалічнай ахоўнай тканіне ёсць і "аргенцінскі кавалачак": вышытыя беларускі арнамент, а над ім — бутэлька з чырвонай зямлёй з Аргенціны. Цяпер вось Ніна Ярмух зрабіла падарунак Зяноне — вышываную хустку з беларускага лёну.

Шмат расказвала Зянона Сабчук пра сучасны прыгожы Абэра. Агульнымі намаганнямі будавалі яго рускія, беларусы, чэхі, палякі, італьянцы... Шматнацыянальны горад: больш за 130 000 жыхароў, больш за 30 храмаў розных канфесій. Ён другі па велічыні ў правінцыі Місьёнэс, знакаміты ўнікальным паркам інтэрнацыянальнай дружбы: там кожная эмігранцкая суполка пабудавала дом-музей у нацыянальным стылі. Штогод ладзяць фестываль прыгажунь у нацыянальных касцюмах. Узгадвала супляменніца і тое, як бацька яе любіў глядзець на зоркі: "Памятую, тата казаў: "У Беларусі зоркі далёка відаць…" Я яго не разумела, а цяпер бачу: сапраўды, далёка".

Шмат год з неверагодны сілай вабіць да сябе аргенцінскую беларуску Зянону Сабчук зямля продкаў І хоць яна з усмешкай кажа, што жыццё — рэч складаная, і дом яе — за тысячы кіламетраў ад мілых сэрцу мясцін, усё ж у яе беларускага мінулага можа быць прыцяг. Унучка Вікторыя, якая ўпершыню пабывала ў Беларусі, казала: "Я б хацела пераехаць жыць у Беларусь ці, прынамсі, вучыцца тут!"

ВЕСТКІ

# Вучоба карыстаецца папулярнасцю

Карына Капітонава

**Колькасць замежнікаў, якія жадаюць атрымаць адукацыю ў беларускіх універсітэтах, акадэміях ці інстытутах прыкметна павялічваецца**

Як паведаміў журналістам першы намеснік міністра адукацыі Вадзім Богуш, у цэлым колькасць замежнікаў, якія атрымліваюць адукацыю ў Беларусі, складае каля дзевятнаццаці тысяч чалавек. Большая частка — гэта студэнты вышэйшых навучальных устаноў.

Замежныя грамадзяне прыязджаюць у Беларусь, каб атрымаць прафесійную моўную адукацыю. Найбольш запатрабаваныя сферы, звязаныя з эканомікай, высокімі тэхналогіямі. Карыстаецца папулярнасцю і медыцынская адукацыя. Многія выбіраюць спецыяльнасці ў сферах камунікацый, права, эканомікі і кіравання. Геаграфія краін вельмі шырокая — гэта больш за 60 дзяржаў. На працягу некалькіх год самая вялікая колькасць навучэнцаў прыязджае з Туркменістана, Расіі і Кітая. Таксама ў Беларусі навучаюцца студэнты з Нігерыі, Ірана, Азербайджана, Украіны, Казахстана, Лівана, Турцыі, Сірыі.

**Даведка ГР.** Па дадзеных Белстата, Беларусь займае лідзіруючыя пазіцыі сярод дзяржаў СНД па колькасці студэнтаў на 10 тысяч чалавек насельніцтва. У 2016 годзе ў 53 беларускіх ВНУ вучацца 336,4 тысячы чалавек, прычым на 100 студэнтаў-юнакоў прыходзіцца 130 дзяўчат.

**ТАЛЕНТЫ З ДЫЯСПАРЫ**

# Чароўныя акарыны Ганны Радзівонавай



**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Так што мая парада актывістам беларускага руху: не стамляйцеся “сеяць зерне”, выступаць у самых розных аўдыторыях — і да вас таксама абавязкова прыцягнуцца людзі неардынарныя, таленавітыя.

Прызнацца, нам, іркуцкім беларусам, і самім вельмі цікава пабачыць (і пачуць!), што атрымалася ў выніку смелага мастацкага эксперыменту Ганны Радзівонавай. Нават на здымках відаць, што ўсё гэта — здорава! Мастачка выдатна перадае ў сваіх творах невымоўны сэнс Гукання Вясны: гэта ж і сунастрой душы чалавека з Дыханнем Вечнасці, адладжванне дыялогу з нябачнымі магутнымі сіламі, што абуджаюць увесну як Зямлю-маці, так і душу кожнага з нас. А якая цёплая, лагодная, можна сказаць, стылістыка выканання акарын у матэрыяле! Безумоўна, яна — беларуская, народная, хоць творы й зроблены з сібірскай гліны. І галоўнае: Ганна ж і сама спасцігае таямніцы грання на тых інструментах, якія змайстравала. Чуйна ловіць настрой, гучанне кожнай акарыны. І ўсё беларускае ёй цяпер — не чужое: тое відаць і ў апісанні кампазіцыі, у аповедзе мастачкі пра само беларускае Гуканне Вясны.

Цікава, што на зробленых Ганнай Радзівонавай інструментах можна граць па нотах. І мы не выключаем, што ў будучыні — напрыклад, у пару чарговага Гукання Вясны — яе чароўныя акарыны загучаць, можа, і на вясновай прыродзе, і ў канцэртнай зале ў руках прафесіяналаў. А канцэрт назавем, напрыклад, так: “Гукі Вясны і Бацькаўшчыны: Чароўныя акарыны Ганны Радзівонавай”… Дарэчы, некаторыя з яе акарын запатрабавалі складанай тэхналогіі вырабу. Расказвала: для стварэння новых вібрацыйных патокаў, напрыклад, каб атрымаць музычны строй ЛЯ-СІ-РЭ-МІ-СОЛЬ, яна зрабіла ў інструменце дзве ўваходныя адтуліны, там і дзве камеры. Ганна старанна адпрацоўвала гучанне кожнай ноты, кансультуючыся ўвесь час з музыкамі-спецыялістамі. Цяпер, пэўна, і прафесійныя выканаўцы, якія граюць на акарынах, не маюць “інструментаў ад Ганны Радзівонавай”, з такімі шырокімі магчымасцямі. Бо, як сцвярджае мастачка, любую прыладу з яе цяперашняй калекцыі — і іх ужо больш за паўсотні — можна падладзіць пад любую паслядоўнасць тонаў і паўтонаў.



**Вырабы ад Ганны Радзівонавай**

Ад усіх беларусаў выказваю падзяку Ганне — за тое, што паказала нам, як трэба ўмець слухаць і чуць сваё роднае, як разумець і бачыць яго, прыкмячаць у родным прыгажосць і самім тварыць красу па яго́ных узорах. Дзякуй табе, Ганна, і за эстэтычную асалоду, якую маюць усе ад тваіх твораў. Дарэчы, пры афармленні выстаў мы выкарыстоўваем ручнікі з калекцыі ІТБК: здорава атрымліваецца!

Спадзяемся, арыгінальныя працы Ганны Радзівонавай шырока пойдуць па свеце, сваім выглядам ды непаўторнымі галасамі пашыраючы ўсюды беларускую прысутнасць. Так што, сябры, дасылайце нам заяўкі на арыгінальныя керамічныя вырабы! Альбо запрашайце з выставай: прыедзем, пакажам, раскажам, пайграем, ды яшчэ й паспяваем.

**Алена Сіпакова,**
кіраўніца Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага

# Такія галасістыя птушкі

**Ганна Радзівонава**

Птушкі як увасабленне боства іграюць важную ролю ў міфах розных народаў пра стварэнне свету. Напрыклад, ёсць такая версія: сярод бязмежных водных прастораў, якія былі пачаткам усіх пачаткаў, стаяла дрэва. І ад дзвюх птушак, што звілі на ім гняздо, пачалося жыццё на Зямлі. Дрэва, або Дрэва жыцця, стала сімвалам усяго жывога, а дзве птушкі, што ахоўваюць яго — сімвалам дабра і сямейнага шчасця. Усё цалкам азначала жыццё і дабрабыт. Яйкі ў гняздзе — гэта сімвал жыцця, якое зараджаецца.

У маіх творах, кампазіцыях і птушкі, і яйкі ўпрыгожаны беларускімі арнаментамі, сярод знакаў-сімвалаў у якіх пераважае тэма ўрадлівасці зямлі. Я выкарыстоўваю чырвона-белае рашэнне арнаменту, а таксама арнаменты ў цёплых, прыродных танах. Ідэі, матывы для працы я шукала ў беларускай народнай культуры, у якой зберагглося ўнікальнае свята: Гуканне Вясны. Клічуць Вясну з Неба на Зямлю. Свістулькі ў гэтым свяце — самы надзейны інструмент, каб пагукаць-заклікаць доўгачаканую Вясну. Таксама і дрэвы на месцы правядзення абраду беларусы ўпрыгожваюць стужкамі, птушкамі ды кветкамі.

У Іркуцку штовесну старажытнае беларускае свята Гуканне Вясны праводзіць Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага. На гэтым свяце кожны — не старонні, не проста глядач, а ўдзельнік. Кожны далучаны да свята: сваім адзеннем, адпаведнай песняй, танцам. Я ж далучаюся сваімі музычнымі інструментамі. Для гэтай мэты і створаны мае керамічныя свістулькі ды акарыны. А нанесеныя на іх паверхню старажытныя арнаменты, спадзяюся, разам з гукамі будуць спрыяць пашырэнню ў свеце ладу, гармоніі, дабрыні, прыгажосці. Бо не сакрэт: ад таго, як мы самі разумеем, адчуваем, перажываем прыгожае, узвышанае, шмат у чым залежаць і нашае быццё



**Беларускія дзяўчаты ў Іркуцку**

ў гэтым вялікім свеце. Прыгажосць рэчаіснасці ды мастацтва — гэта той канал, тая высокая вібрацыя, дзякуючы якой мы спазнаём ды ўмацоўваем ва ўласнай свядомасці пазітыўныя грамадскія ідэалы. Настройваючы сваю ўласную душу на хвалю Прыгажосці — а гэта якраз і адбываецца ў тым ліку і на старадаўнім беларускім свяце Гукане Вясны — мы адначасова і сябе ўпрыгожваем, і гарманізуем свае ўзаемастасункі з людзьмі, з усім Светам, бачным і нябачным.

**ВЕСТКІ**

## Адкрыццё з нечаканага боку

**Аліна Немагай**

**Пра Мінск кінематаграфічны даведаліся наведнікі экскурсіі-прадмовы да фестывалю “Класіка ля Ратушы”**

Кожную суботу мінскія кварталы Верхняга Горадаператвараюцца ў сцэнічную пляцоўку фестывалю “Пешаходка”, дзе выступаюць музычныя і тэатральныя калектывы, перформеры, удзельнікі клубаў гістарычнай рэканструкцыі, гандлююць рамеснікі.

Нядаўна прайшла і незвычайная кінаэкскурсія па Мінску, якая стала прадмовай да канцэрту музыкі савецкага кіно. Горад паўстаў у ёй у нечаканым выглядзе: як месца здымак многіх беларускіх, савецкіх і нават галівудскіх фільмаў. Цікава было даведацца пра тое, якія вядомыя фільмы здымаліся ў Мінску і якія будынкі маюць у сваёй гісторыі кінематаграфічныя старонкі, імёны якіх вядомых рэжысёраў і акцёраў звязаны са сталіцай Беларусі, а таксама якія стужкі здымаюцца на мінскіх вуліцах сёння.

Неверагодна, але менавіта ў Мінску нарадзіўся Луіс Барт Маер, адзін з заснавальнікаў Галівуда, кіраўнік знакамітай студыі Metro-Goldwyn-Mayer і Амерыканскай акадэміі кінематаграфічных мастацтваў і навук, ініцыятар стварэння прэміі “Оскар”. У Мінску пачынаў кінакар'еру і знакаміты акцёр Алег Янкоўскі. Мінскія ж вуліцы ды паркі часта “граюць ролю” маскоўскіх і піцерскіх, а з нядаўняга часу яшчэ й перуанскіх. Так, Траецкае прадмесце неаднойчы станавілася здымачнай пляцоўкай для тэлесерыяла “Каменская”, выступаючы ў якасці ўтульных куточкаў то Германіі, то Чэхіі. А ў 1998 годзе ў Мінску здымаў фільм галівудскі рэжысёр Менахем Голан.

Не сакрэт, што кінамастацтва цесна звязана з музыкай. У многіх стужках гучаць творы вядомых кампазітараў, а некаторыя мелодыі, якія сёння ўспрымаюцца як класічныя, былі напісаны спецыяльна для фільмаў. Так, на канцэрце ля Ратушы гучала музыка з фільмаў “Звезда пленительного счастья”, “Женитьба Бальзаминова”, “Кин-дза-дза”, “Мимино”. Парадвала слухачоў і музыка беларускага кампазітара Яўгена Глебава да стужкі “Последнее лето детства”. Прагучалі класічныя кампазіцыі ў джазавай апрацоўцы, музыка танга з вядомых фільмаў у выкананні квартэта VSOP..

**ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ**

# Твар руплівай гаспадыні

Добры дзень, шаноўная рэдакцыя! Я чуў пра конкурс “Гаспадыня-беларусачка”. Ведаю, газета пісала: гэтае ганаровае найменне ўжо маюць некаторыя з актывістак беларускай дыяспары. Мне ж як мастаку помніцца: калі прэзентаваўся той праект, адначасова быў прапанаваны і візуальны сімвал гаспадарлівай беларускі. То быў партрэт дзяўчыны з карціны Пётры Мірановіча “Беларусачка”. Наколькі мне вядома, карціна знаходзіцца цяпер у Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі. Яго перадаў калісьці ў будучы музей “Беларусы свету” Сяргей Панізьнік, набыўшы твор у Рызе ў дачкі Сяргея Сахарава. А паколькі на партрэце не было аніякіх подпісаў, не была напісана і назва карціны, то Сяргей Панізьнік назваў яе: “Беларусачка”.

Аднак ці беларуска на самой справе на той карціне? Я цяпер даследую жыццё і творчасць беларускага мастака з Латвіі Пётры Мірановіча. І вось пад час даследчай працы выявіў: гэта не партрэт беларускай дзяўчыны. Гэта Мірановіч намаляваў копію з рэпрадукцыі карціны рускага мастака Аляксандра Аляксеевіча Бучкуры. На партрэце, калі ўважліва прыгледзецца, дзяўчына — у адзенні рускай разанскай вясковай жанчыны. Падобныя партрэты Бучкуры шмат маляваў на пачатку ХХ стагоддзя. Таму гэты партрэт як сімвал не падыходзіць для вышэйзгаданага конкурсу.

Што ж рабіць? Я прапаную сімвалам конкурсу “Гаспадыня-беларусачка” надалей зрабіць прыгожы партрэт сапраўднай беларусачкі — карціну “Папрадуха” мастака Міхася Сеўрука. Здымак я сканіраваў з кнігі Віктара Шматава “Міхась Канстанцінавіч Сеўрук”, якая пабачыла свет у 1980 годзе ў выдавецтве “Беларусь”. Магчыма, сама карціна зберагаецца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

Усяго Вам найлепшага.

**Вячка Целеш,** г. Рыга



**Міхась Сеўрук. Папрадуха**

**Ад рэдакцыі.** Дзякуй за каштоўнае ўдакладненне, спадар Вячка. Сапраўды, твор вядомага жывапісца і графіка Міхася Сеўрука будзе больш дарэчы ў якасці візуальнага сімвала. Інтэрнэт падказвае: Міхась Канстанцінавіч з 1939 па 1979 гады жыў і працаваў у Нясвіжы, дзе і пахаваны на мясцовых могілках. У памяць пра таленавітага майстра і для захавання яго багатай спадчыны ў горадзе ў 1994 годзе адчынена кватэра-музей Міхася Сеўрука, у якім захоўваюцца больш за 1100 прац і асабістых рэчаў мастака. Дарэчы, гэта Міхась Сеўрук — аўтар вокладак зборнікаў Максіма Танка “На этапах” (1936) і песень Рыгора Шырмы “Наша песня” (1938), графічных прац “Віленская Alma mater” (1937) ды іншых.

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

# Родны бераг мастака

## Творчасць Станіслава Жукоўскага, маленства якога прайшло пад Ваўкавыскам і Пружанамі, прыцягвае ўвагу сяброў Мастацкага аб’яднання “Таварыства перасоўных мастацкіх выстаў. XXI стагоддзе” з Санкт-Пецярбурга

Спачатку — колькі слоў пра месца нараджэння знакамітага мастака. У нэце знаходзім: “Нарадзіўся 13 траўня 1875 года ў вёсцы Ендрыхаўцы, ля мястэчка Рось” — на той час Ваўкавыскі павет, Гарадзенская губерня Расійскай імперыі. Дарэчы, у дакументах на хрышчэнне, што адшукаліся ў Роскім рымска-каталіцкім парафіяльным касцёле, згадваецца “мыза Ендрыхаўцы”: сёння гэта аграгарадок у складзе Роскага сельсавета. І хоць пісаўся Жукоўскі палякам, але заўсёды быў патрыётам роднага краю, Гарадзеншчыны. На ягоных карцінах ёсць Палессе, Нёман, Белавежская пушча... Даследчыкі творчасці майстра сцвярджаюць: усе свае найлюбімыя творы ён напісаў у Беларусі. Увогуле ж гэта — вялікі мастак як Беларусі, так і Польшчы, і Расіі.

Як вядома, сусветная мастацкая прастора шчодра ўзбагачаецца талентамі, што прыйшлі ў жыццё на нашай зямлі: Валенцій Ваньковіч, Марк Шагал, Надзея Хадасевіч-Лежэ, Леў Бакст, Хаім Суцін, Вітольд Бялыніцкі-Біруля, Станіслаў Жукоўскі… Вось і да творчасці апошняга звярнуліся мастацкая галерэя “Універсітэт культуры” і Мастацкае аб’яднанне “Таварыства перасоўных мастацкіх выстаў. XXI стагоддзе” (Санкт-Пецярбург): разам зладзілі ў Мінску выставу па выніках Міжнароднага пленэра жывапісу, прысвечанага 140-годдзю вялікага майстра пейзажа, інтэр’ера, нацюрморта. Нагадаем, Станіслаў Юльянавіч Жукоўскі быў акадэмікам Расійскай імператарскай акадэміі мастацтваў, ён жа заснавальнік і сябра Саюза рускіх мастакоў, да таго ж вучань Ісака Левітана, выпускнік Маскоўскага вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства.



У мастака Валерыя Вычужаніна свой інтарэс да Беларусі



Станіслаў Жукоўскі. Рака Нёман. 1895 г.

Пленэр адбыўся ў родных мясцінах Станіслава Жукоўскага на Пружаншчыне. Бацькі мастака мелі там спадчынную сядзібу, у Староволі (Старой Волі), аднак, чытаем у нэце, “за ўдзел у паўстанні 1863-64 гадоў пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага Юльян Жукоўскі быў пазбаўлены шляхецтва і ўсіх сваіх уладанняў”. З часам Жукоўскія зноў вярнуцца ў родныя мясціны: у якасці арандатараў. Таму і пісаў мастак, што ў маёнтку Старая Воля “правеў я ўсё сваё дзяцінства”. На пленэр сабраліся 10 творцаў з Віцебска, Брэста, Гродна, Санкт-Пецярбурга, Масквы, Архангельска, Пяцігорска, Уладзіміра, Таганрога, Алушты. Вынік іх працы — каля 100 палотнаў — і прымала наша мастацкая галерэя.

Выстава мела вялікі грамадскі рэзананс. Быў, як вядома, час, калі пейзажу адводзілася роля дэкарацый пры “апяванні” поспехаў савецкіх людзей у пераўтварэнні прыроды. Цяпер мастакі з натхненнем выяўляюць хараство прыроды, гармонію наваколля. Варта ўзгадаць: менавіта развіццё пленэраў і спрыяла станаўленню пейзажнага жывапісу. Між тым вобразы, створаныя Станіславам Жукоўскім, дапамагаюць творцам з розных краін бліжэй прыгледзецца да прыгажосці Беларусі. Вялікую цікавасць да яе, ладу жыцця і ментальнасці мясцовых творцаў мае, у прыватнасці, кіраўнік Таварыства перасоўных мастацкіх выстаў, кандыдат тэхнічных навук, мастацтвазнаўца Валерый Выбаржанін. Інжынер-выпрабавальнік самалётаў па першай прафесіі, мастацтвазнаўца па другой, ён стаў ініцыятарам шматлікіх мастацкіх праектаў у розных рэгіёнах Беларусі, сярод якіх і згаданы пленэр.

Задумы ў творчых людзей, падзвіжнікаў духу, вялікія. Адна з іх — стварэнне Мемарыяльнага музея імя Станіслава Жукоўскага ў Пружанскім раёне. Пакуль жа іх творы будуць знаходзіцца ў сядзібе “Жураўлінае”: своеасаблівы “пружанскі вулей”, прытулак, у якім з 12 па 25 ліпеня жылі, працавалі мастакі. Падрабязней — на сайце http://www.zhuravlinoe.tk/ Сядзіба — у вёсцы Вялікае Сяло, побач з той самай Старой Воляй. Гаспадыня сядзібы Святлана Машкала і будзе захоўваць у старадаўніх сценах калекцыю будучага музея.

Творы з пленэру, з плыні творчых ідэй Станіслава Жукоўскага будуць дэманстравацца на Гомельшчыне, у Буда-Кашалёўскай карціннай галерэі імя Яўсея Маісеенкі (у жніўні ў мастака, Героя Сацыялістычнай Працы — 100-гадовы юбілей!), што знаходзіцца пад патранатам Валерыя Выбаржаніна.

**Павел Сапоцька,**
дырэктар мастацкай галерэі “Універсітэт культуры”

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## Светлыя згадкі пра паэта

**Рыгор Арэшка**

**Літаратурны музей Максіма Багдановіча запрашае далучыцца да фотаконкурсу: ён ладзіцца даюбілею класіка**

Сапраўдная паэзія — гэта тое, што па-за часам. Яна лучыць нас з Вечнасцю, прыадкрываючы велізарныя сусветы ў нас саміх. Прычым у кожнага няспешнага чытача адны і тыя ж радкі могуць выклікаць розныя асацыяцыі, успаміны. Апошнія, дарэчы, Максім Багдановіч называў: згадкі (ад слова згадваць). Знакамітыя радкі сталі песняю: “Зорка Венера ўзышла над Зямлёю/, Светлыя згадкі з сабой прывяла”. . .

А якія згадкі-ўспаміны выклікаюць у вас творы Максіма Багдановіча, песні на яго словы, прысвечаныя яму творы мастацтва? Ёсць магчымасць пра тое расказаць, далучыўшыся да фотаконкурсу “Мой Максім Багдановіч”. “Варта прыкласці намаганні, каб знайсці для сябе сваю гісторыю, сваю Беларусь, свайго Максіма Багдановіча — чалавека, без якога немагчыма ўявіць нашу краіну, — пішуць у прэс-рэлізе музейшчыкі. — На яго творах “Зорка Венера”, “Апокрыф”, “Пагоня” ды іншых мы з дзяцінства вучыліся мастацтву любові, прыгажосці, вернасці Бацькаўшчыне.

Але хто для кожнага з нас Максім? Прапануем паўдзельнічаць у фотаконкурсе, адказаць на гэтае пытанне. Паспрабаваць глыбей зразумець паэта і адлюстраваць сваё бачанне”.

Можна паказаць мясціны, звязаныя з паэтам, зрабіць фотарэпартаж з імпрэзы, дзе чытаюць яго творы. А можа нехта створыць асацыятыўны партрэт Максіма?

На конкурс можна дасылаць (да 31 кастрычніка) фотаработы ў розных тэхніках. Колькасць работ ад аднаго ўдзельніка — не абмежаваная. Больш падрабязна пра конкурс чытайце на сайце музея http://bagdanovich.by/by/photocontest

РАЗАМ

# Дзе зоры глядзяцца ў азёры

**Даўгаўпілскія беларусы запалілі “Перабродскую зорку” ў Мёрскім раёне Віцебшчыны, а потым гасцявалі ў Браславе**

Не стамляемся адкрываць для сябе ўсё новыя прыгожыя мясціны роднай Бацькаўшчыны. У сярэдзіне ліпеня, на вяршыні лета пашчасціла творчым гуртам з Даўгаўпілса пабываць у Пераброддзі. Маляўнічая вёска — на беразе дзіўнай прыгажосці возера. Там ладзіўся юбілейны, X фэст народнай творчасці “Перабродская зорка”. З даўгаўпілскага Цэнтра беларускай культуры па запрашэнні аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мёрскага райвыканкама паехалі два калектывы: танцавальны “Лянок” (кіраўніца Яніна Юзэфовіч) і вакальны сеньёраў “Спадчына” (кіраўніца Вера Сухарава).

Фэст быў з размахам: выступалі артысты з Мёрскага раёна, Браслава, Шаркаўшчыны, Пастаў, Верхнядзвінска. І мы цудоўна ўпісаліся ў святочную праграму. Быў, напрыклад, амаль гадзінны канцэрт даўгаўпілскіх артыстаў. Захапленне, авацыі гледачоў — так здорава бачыць і чуць! Нам падпявалі, з намі падтанцоўвалі, нават карагод вадзілі: гэта “інтэрактыў” такі ад “Лянка”. Вядучая праграмы, метадыст ЦБК Марыя Пamецька павіншавала арганізатараў, творчыя гурты і гасцей фэсту са святам, хораша пажадала ўсім творчага натхнення, цудоўнаму краю — росквіту, і падарункі ўручыла.

Пасля канцэрту, прагулкі па вёсцы, смачнага абеду ў кафэ на беразе возера гасцей-даўгаўпілсцаў павезлі ў Браслаўскі музей традыцыйных культур. Ён — пры возеры, у былым млыне: помніку архітэктуры пачатку XX стагоддзя. Дырэктар музея Эла Зінкевіч расказала шмат цікавага пра экспазіцыі, прысвечаныя ткацтву, пляценню, мясцовым разьбярам. Пабачылі мы прыстасаванні для апрацоўкі лёну, воўны, працы з глінай, бачылі творы мастакоў, народных майстроў. А колькі цікавага ў традыцыях, звычаях жыхароў Браслаўшчыны! У знак падзякі гурт “Спадчына” выканаў песню “Мірта”.

Заснавальніца таварыства “Уздым” Яўгенія Гуляева перадала ў фонд музея рэліквіі бацькі, ветэрана Другой сусветнай вайны Вячаслава Ігнатавіча Ардынскага: ордэны, медалі, ваенны білет, фотаздымкі, іншыя каштоўныя дакументы. Будзе ў музеі таксама й апісанне гісторыі жыцця гэтага вельмі таленавітага чалавека, які быў выдатным кавалём, пчаляром, сталяром і музыкам. Ён цудоўна граў на баяне, гармоніку, сам зрабіў скрыпку.



Даўгаўпілскі “Лянок” гастраляваў па Віцебшчыне

Паездка стала магчымаю дзякуючы Пагадненням аб супрацоўніцтве паміж ЦБК ды аддзеламі ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мёрскага і Браслаўскага райвыканкамаў. Гэта наша падказка актывістам іншых суполак замежжа: не палянуйцеся афіцыйна аформіць патрэбныя дакументы. Мы ўдзячны за сардэчны прыём намесніцы старшыні Мёрскага райвыканкама Таццяне Стальмачонак, начальніку аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Аляксандру Тронькіну, старшыні сельскага савета Пераброддзя Віктару Дзеравянчыку, а таксама арганізатарам, удзельнікам і гасцям фэсту. Наш паклон за выдатную экскурсію кіраўніцы Браслаўскага музейнага аб’яднання Надзеі Дударонак, дырэктарцы Браслаўскага музея традыцыйных культур Эле Зінкевіч, а за візавую падтрымку — Генконсулу Беларусі ў Даўгаўпілсе Уладзіміру Клімаву.

**Марыяна Міхалевіч,**
г. Даўгаўпілс

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў
**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
**E—mail:** golas_radzimy@tut.by
**Аб’ём выдання:** 1 друк. арк.
**Тыраж:** 1925, **Заказ:** 1162
**Час падпісання ў друк:** 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.
© “Голас Радзімы”, 2016